**ACTA ALBARUTHENICA 22: 2022**
ISSN 1898-8091; e-ISSN 2720-698X
Copyright @ by Hanna Krofta, 2022
Creative Commons: Uznanie autorstwa-Użycie niekomercyjne-Bez utworów zależnych 3.0 PL
(CC BY-NC-ND 3.0 PL)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/3.0/pl/
DOI: https://doi.org/10.31338/2720-698Xaa.22.14

**Ганна Крофта / Hanna Krofta**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Беларусь /
Yanka Kupala State University of Grodno, Belarus
ORCID: https://orcid.org/0000-0001-6676-1273
e-mail: hanna_krofta@mail.com

# Функцыйныя пары “барацьба – перамога”, “задача – рашэнне” ў кнізе Яна Баршчэўскага *Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях*

*Functional pairs “struggle – victory”, “task – decision” in the book* Zavalnya Esqire, or Belarus in Fantastic Stories *by Yan Barshcheuski*
*Pary funkcjonalne “walka – zwycięstwo”, “zadanie – decyzja” w książce* Szlachcic Zawalnia, czyli Białoruś w fantastycznych opowiadaniach *Jana Barszczewskiego*

**ABSTRACT**: The article is devoted to the study of the role of functional pairs “struggle – victory” and “problem – solution” in the structure of 14 short stories by Yan Barshcheuski from the book *Zavalnya, Esqire, or Belarus in Fantastic Stories*. The conclusions are made that in the author’s work the canonical structure of a fairy tale, in which the presence of one of these pairs is mandatory, is significantly modified. At the level of individual stories, the functional correlation is violated, cases of dual morphological meaning of functions are observed. The author uses a minus technique, in which functions are not implemented but their probability is denoted. At the level of the entire work as a whole, the plot balance, however, is achieved, and in the last story *Marvelous Staff* a romantic myth is built, in which a succession of fairy-tale elements is reproduced with new metaphorical meanings.

**KEYWORDS**: Belarusian literature of the 19th century, romanticism, plot, morphology of a magical tale, heroic functions.

Выкарыстанне элементаў фальклорнай паэтыкі ў мастацкім творы, прыналежным па сваёй праблематыцы да рамантычнай літаратуры, наводзіць на думку не толькі аб тым, наколькі захаваны казкавы архетып у апавяданнях *Шляхціца Завальні*, але і, наадварот, аб тым,

якім чынам гэты архетып мадыфікаваны і адрозніваецца ад свайго сюжэтнага эталона.

З пункту гледжання Уладзіміра Пропа,

> марфалагічна чарадзейнай казкай можа быць названае ўсякае развіццё ад шкодніцтва (A) ці нястачы (a) праз прамежкавыя функцыі да вяселля (C*) альбо іншых функцый, якія выкарыстоўваюцца ў якасці развязкі [Пропп 1969: 83].

У. Проп выявіў такую заканамернасць будовы чарадзейнай казкі, як наяўнасць у ёй сістэмы апазіцый: кожнаму элементу адпавядае парны. Елеазар Меляцінскі вызначыў гэты прынцып як прынцып казкавага балансу. Ён выяўляецца ў імкненні казкі да гармоніі, якое казка пераняла ад міфа, праўда, у адрозненне ад міфа, гэтае імкненне мае не глабальны, касмаганічны характар, а накіравана пераважна на асабістую біяграфію героя. Выпадкі ж парушэння казкавага балансу "ўспрымаюцца як пранікненне чужародных утварэнняў і спараджаюць эфект пераходу да іншых жанраў" [*Структура волшебной сказки* 2001: 76].

У. Проп звярнуў увагу на тое, што вылучаюцца дзве пары функцый (барацьба са шкоднікам і перамога над ім, складаныя задачы і іх рашэнне), якія амаль ніколі не сустракаюцца ў межах адной казкі, але займаюць у паслядоўнасці функцый прыкладна аднолькавае месца. Прымяніўшы методыку сюжэтнай марфалагізацыі, прасочым, якім чынам функцыйныя пары "барацьба – перамога" і "задача – рашэнне" рэалізуюцца ў 14 абрамленых апавяданнях з кнігі Яна Баршчэўскага *Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях* з мэтаю вызначыць, якім чынам суадносіцца іх рэалізацыя са зместам цэласнага твора.

Паводле наяўнасці адной з названых функцыйных пар можна вылучыць наступныя тыпы апавяданняў:

| **Тып** | **Апавяданні** |
|---|---|
| Апавяданні, якія ўтрымліваюць у сваёй структуры функцыйную пару "задача – рашэнне" | *Зухаватыя ўчынкі*<br>*Вогненныя духі*<br>*Ваўкалак*<br>*Жабер-трава* |
| Апавяданні, якія ўтрымліваюць у сваёй структуры функцыйную пару "барацьба – перамога" | *Пра чарнакніжніка і цмока, што вылупіўся з яйка, знесенага пеўнем*<br>*Радзімы знак на вуснах*<br>*Валасы, якія крычаць на галаве*<br>*Стагадовы старац і чорны госць*<br>*Чараўнік ад прыроды і кот Варгін"* |

| | |
|---|---|
| Апавяданні, у структуры якіх вылучаюцца абедзве функцыйныя пары | *Вужачая карона*<br>*Белая Сарока*<br>*Дзіўны кій* |
| Апавяданні, у структуры якіх функцыйныя пары “барацьба – перамога”, “задача – рашэнне” не вылучаюцца | *Плачка*<br>*Пакутны дух* |

Спынімся на кожным з тыпаў асобна.

У чатырох апавяданнях утрымліваецца пара функцый “задача – рашэнне” і няма пары функцый “барацьба – перамога”.

У апавяданнях *Зухаватыя ўчынкі* і *Вогненныя духі* ўвага засяроджана на персанажах, якія імкнуцца атрымаць сабе выгоды праз дапамогу сілаў зла. Васілём і Альбертам вораг людзей успрымаецца як той, дзякуючы каму можна авалодаць *шатанскай сілай* і рэалізаваць асабістыя патрэбы і памкненні. Васіль хоча здабыць грошы праз пакланенне д’яблу, дзеля чаго павінен даказаць, што не баіцца страхаў, і пераначаваць каля Цмокавага Камня. Гэтае дзеянне можна вызначыць як складаную задачу, а не выпрабаванне дарыльніка, бо ў выніку яе рашэння здабываецца прадмет, а не чароўны сродак. (На думку У. Пропа, усе задачы, якія датычаць атрымання чароўнага сродку, павінны разглядацца як функцыі дарыльніка, а ўсе астатнія разглядаюцца як складаныя задачы, што выконваюцца ў сувязі ці не ў сувязі са шлюбам [Пропп 1969: 62].) Сюжэтны баланс парушаецца: прадмет не здабыты, а сам Васіль знікае. Дарэчы, выпрабаванні дарыльніка ў апавяданні *Зухаватыя ўчынкі* таксама ёсць, але яны рэдукуюцца да спробаў Васіля даказаць сваю смеласць і звышздольнасці. Васіль сцвярджае, што валодае якасцямі пасярэдніка паміж гэтым светам і іншым, аднак выпрабаванняў дзеля набыцця гэтых вартасцяў ён не праходзіць, што лагічна суадносіцца ў далейшым з адсутнасцю рашэння складанай задачы.

У апавяданні *Вогненныя духі* задача выконваецца праз жаданне Альберта “здранцвець, быць абыякавым, як труп, халодным, як ледзяная брыла” [Баршчэўскі 2014: 151]. Па парадзе чарнакніжніка – чалавека з чырвонымі валасамі – Альберт запрашае да сябе на забавы халодных духаў з цвінтара і ў выніку кантактаў з імі становіцца халодным, як кавалак золата.

Наступныя два апавяданні з функцыйнай парай “задача – рашэнне” збліжаюцца тым, што праз выкананне складанай задачы героі падрыхтоўваюцца да барацьбы.

Марка ў апавяданні *Ваўкалак* пад уздзеяннем шкодніцтва з боку дудара Арцёма і *некага незнаёмага* [Баршчэўскі 2014: 80] зазнае

трансфігурацыю і становіцца страшным зверам, ворагам для вясковых людзей і сябе самога:

> Расла мая нянавісць да людзей, калі я думаў пра іх крывадушнасць, несправядлівасць, незычлівасць да роўных сабе. Вырашыў я шкодзіць ім ва ўсім, як яны шкодзяць адзін аднаму пры зручным выпадку, абы толькі мець сабе карысць [Баршчэўскі 2014 : 82].

Пераўвасабленне ў цёмнага двайніка распаўсюджана ў літаратуры рамантызму, а менавіта ў творах пра допэльгангераў (допэльгангер – двайнік, цёмны бок асобы). Найбольшую небяспеку нясе тое зло, якое здольнае прыняць аблічча сваёй ахвяры. Дзеля перамогі над ім патрэбны ўнутраныя змены. Аповед развіваецца далей па мадэлі "задача – рашэнне". Марка, імкнучыся пазбыцца сваёй нястачы (ваўчынага аблічча), выпраўляецца пошукі сродку, з дапамогай якога можна зноў зрабіцца чалавекам, – гэта *зёлка з дробненькімі блакітнымі кветачкамі* [Баршчэўскі 2014: 84] (на думку Міколы Хаўстовіча, гэта незабудка, адшукаўшы якую, чалавек можа аднавіць уласную і гістарычную памяць [Хаўстовіч 2003: 99]; згадаем таксама і блакітную кветку Наваліса – сімвал таямніцы сусвету, духоўнага і творчага пошуку).

Памяць сапраўды вяртаецца да Марка пасля сустрэчы з Ганкай, якую ён, зрабіўшыся ваўкалакам, скраў ад бацькоў і занёс у лес, дзе дзяўчына трапіла да Аксінні, але ўспаміны адгукаюцца толькі болем і пачуццём віны. Каб вярнуцца ў цела чалавека, герой мусіць прайсці шэраг іспытаў, якія выконваюцца ўжо не дзеля здабывання чароўнага прадмета, а значыць, могуць быць аднесеныя да складаных задачаў. Якім чынам трэба дзейнічаць далей, Марка ўсведамляе, паслухаўшы прамову ксяндза да парафіянаў. Задачы Марка задае сабе сам: дапамагае сялянам, ратуючы свойскую жывёлу ад звяроў, выратоўвае ад ваўка дзіцё Алёны. Разам з гэтым адбываецца і вяртанне любові да бліжніх: Марка цешыцца, што Алёна шчаслівая, не адчуваючы больш злосці і прагі помсты.

Далейшы шлях вызвалення ад звярынай сутнасці герой праходзіць у сне. Гэты шлях таксама ўяўляе сабою этапы аднаўлення памяці: пра шчаслівую маладосць, вярнуцца ў якую немагчыма, бо акрамя вясновых радасных кветак у садзе жыцця выраслі і кветкі граху, і кветкі смерці – рваць і нішчыць іх нельга, бо нельга забывацца пра сумленне (сон пра Ганку і белыя лілеі); пра бацькоўскую хату і родную вёску, якія немагчыма ўбачыць, не змяніўшыся, не заслужыўшы даравання; пра загінулых продкаў – магутных асілкаў, чыя моц урэшце дапамагае Марку зноў атрымаць чалавечае аблічча.

Ці аказваецца ў выніку зло пераможаным, ці пераадольваецца ўнутраная раздвоенасць? Не, бо першая радасць ад спазнання Божай

міласэрнасці і далучэння да свету людзей неўзабаве замяняецца маркотай і неспакоем. Відаць, каб перайсці да *новага жыцця*, трэба выкарыстаць дар памяці і любові на карысць людзям, і Марка, такім чынам, становіцца адным з абраных, пакліканых да будучай перамогі (пры гэтым функцыйная пара “барацьба – перамога” ў апавяданні застаецца нерэалізаванай).

У апавяданні *Жабер-трава* складаная задача рашаецца ў сувязі з пошукамі Адольфа, які, выкарыстаўшы сілу жабер-травы і даведаўшыся пра смутную будучыню Айчыны, шукае шлях дадому. Задачу задае цыган Шылка, накіроўваючы героя на ўтравелую вузкую сцежку, што ідзе праз камяністае поле і цёмныя бары. У падарожжы выпрабоўваюцца мужнасць і цярпенне Альберта, яго вернасць роднаму краю. Разам з тым, прасторавае перамяшчэнне героя да прадмета пошукаў прыводзіць яго і да месца будучай барацьбы: “Ледзь падышоў да таго месца, як выходзіць з гаю нейкая кабета – высокага росту, у белай сукні, твар заліты слязьмі, і, трымаючы ў руцэ меч, спыняецца каля дарогі” [Баршчэўскі 2014: 207]. Функцыі барацьбы і перамогі не рэалізуюцца, але абазначаецца далейшы верагодны рух аповеду (аўтар выкарыстоўвае мінус-прыём), прычым больш выразна, чым у апавяданні *Ваўкалак*.

У наступнай групе апавяданняў, якія ўтрымліваюць у сваёй структуры пару “барацьба-перамога”, баланс у сюжэце часцей за ўсё парушаны. Вораг заўсёды перамагаецца: праз веру (*Пра чарнакніжніка і цмока, што вылупіўся з яйка, знесенага пеўнем*, *Радзімы знак на вуснах*, *Стагадовы старац і чорны госць*), праз моц слова (*Чараўнік ад прыроды і кот Варгін*), праз дар адрозніваць добрае ад кепскага, шанаваць сапраўдныя каштоўнасці (*Валасы, якія крычаць на галаве*). Аднак зло не ліквідуецца канчаткова, а толькі змяншаюцца яго моц і ўплыў на людзей. Пры паслядоўнай наяўнасці функцыі перамогі ў большасці выпадкаў адсутнічае функцыя барацьбы. Калі знаходзіцца сродак, здольны знясіліць ці прагнаць антаганіста, той заўсёды адступае і не змагаецца, часам, праўда, помсцячы, як у апавяданні *Пра чарнакніжніка і цмока, што вылупіўся з яйка, знесенага пеўнем*. Адсюль лагічна вынікае пытанне: ці ёсць у апавяданнях герой-пераможца? Персанажы, якіх можна такімі лічыць, з’яўляюцца толькі напрыканцы кнігі – у дванаццатым і трынаццатым апавяданнях: *Стагадовы старац і чорны госць* ды *Чараўнік ад прыроды і кот Варгін*. У астатніх выпадках перамога рэалізуецца дзякуючы ўмяшанню Божай сілы альбо праз падман антаганіста, які, абяцаючы розныя даброты, прыводзіць пасобніка-ахвяру да пагібелі ці пакарання.

Варта адзначыць два апавяданні, у якіх функцыйныя пары “барацьба – перамога”, “задача – рашэнне” рэдукуюцца, і менавіта яны

з’яўляюцца аднымі з найбольш сэнсава значных у кнізе. Гэта апавяданні, вытрыманыя ў духу рамантычнай містыфікацыі: *Плачка* і *Пакутны дух*. Яны дапаўняюць і канкрэтызуюць сэнс адно аднаго, а таксама і ўсяго твора цалкам. Надзея Чукічова ў якасці іспыта Плачкі інтэрпрэтуе пазнаванне яе ў вобліку “журботнай сіраціны ў сялянскім уборы, а ў якасці складанай задачы царэўны наступную: ажывіць руіны і пусткі, засяліць людзьмі нежылыя сядзібы” [Чукічова 2017: 49]. У апавяданні *Пакутны дух* героем выступае якраз той, хто здольны выканаць складаную задачу Плачкі, бо ведае аблiччы зла, але не хоча быць яго памагатым, валодае дарам памяці, але пакуль не бачыць мэты сваіх блуканняў і не разумее, якім чынам можна прымяніць свае здольнасці.

Нарэшце, ёсць група апавяданняў, у марфалагічнай структуры якіх утрымліваюцца абедзве функцыйныя пары, і, адпаведна, у сюжэце якіх можна вылучыць два ходы. Прытым ходы размяшчаюцца не паслядоўна, а спалучаюцца, даючы двaістае марфалагічнае значэнне некаторых функцый.

Напрыклад, у апавяданні *Вужачая карона* праз дарэнне чараўнік здзяйсняе шкодніцтва. Сямён, атрымаўшы карону і чароўнага памочніка – чорнага сабаку, з аднаго боку, становіцца “найслаўнейшым паляўнічым” [Баршчэўскі 2014: 75]. З іншага боку, ён страчвае давер і павагу аднавяскоўцаў, якія падазраюць яго ў чараўніцтве. Карыстанне дарамі паганскіх багоў стварае пагрозу для душы чалавека, і ў гэтым заключаецца галоўнае шкодніцтва, учыненае старцам. Паколькі гаворка ідзе аб шкодзе нематэрыяльнага характару, то і перамога над антаганістам мусіць быць атрыманай не ў знешняй барацьбе з ім, а ў выніку дзеянняў, звязаных з пэўнымі трансфармацыямі душы. Разрыў Сямёна з нячыстымі сіламі адбываецца праз уздзеянне пасвянцонага крыжыка. Заўважым, што падобным чынам прадмет можа выкарыстоўвацца і ў сітуацыі перамогі ў чарадзейнай казцы: “царэўна, апантаная д’яблам, вешае на шыю абраз” [Пропп 1969: 50], у выніку чаго варожая сіла вылятае вон.

Цалаванне крыжыка аднaчасова можа быць вызначана і як складаная задача, якая выконваецца ў сувязі са шлюбам. Марыся, у адрозненне ад царэўны казкавай, з’яўляецца не ў пачатковай сітуацыі, а напрыканцы твора. Дзяўчына дае герою наступную задачу: “Я нашу на шыі пасвянцоўны ў час Юбілею крыжык, які мае наданыя адпусты, – пацалуй мой крыжык” [Баршчэўскі 2014: 76].

Выкананне задач царэўны, згодна з канонам чарадзейнай казкі, павінна прыводзіць да вяселля і ўцаравання. Ускосна і дзеянні Сямёна звязаны са сватаннем: ён хоча спадабацца Марысі, дабіваецца сімпатыі дзяўчыны. Аднaчасова Сямён ажыццяўляе валявое рашэнне, дзейнічае ў сваіх інтарэсах, тады як напачатку, жадаючы атрымаць дапамогу злых

духаў, ён выконваў волю не сваю, а панскую. Уцараванне тут можна вытлумачыць у метафарычным сэнсе: і як магчымасць трапіць у Царства Божае ў выніку адмаўлення ад язычніцтва, і як вяртанне ўласнай волі чалавека, які становіцца сабе гаспадаром.

Такім чынам, структура апавядання распадаецца на два ходы: 1) ход “задачай – рашэннем”; 2) ход “барацьбой – перамогай”. Міфалагічны ж сюжэт аб здабыванні змяінай кароны дапаўняецца і разгортваецца, а таксама атрымлівае метафарычны сэнс.

У марфалагічнай структуры апавядання *Белая Сарока* таксама вылучаюцца дзве ўзаемавыключныя пары функцый. Першы ход з функцыйнай парай “задача – рашэнне” – пра пана Скамароху і ліквідацыю ягонай нястачы (патрэбы ў багацці), дзеля чаго ён заручаецца падтрымкай Белай Сарокі і вытрымлівае яе выпрабаванне дарыльніка: добра падрыхтавацца да візіту. Затым Скамароха паспяхова спраўляецца са складанай задачай – распаўсюдзіць уплыў Сарокі ў Беларусі, за што атрымлівае пэўныя выгоды: у адрозненне ад іншых паноў, якія засталіся піць слёзы няшчаснага люду, ён выязджае ў палац Белай Сарокі. Вядома, “узнагарода” атрымалася неадназначнай. Па-першае, у выніку выканання задачы пан Скамароха не ўзяў шлюб і не ўцараваўся, але толькі наблізіўся да такой прывабнай для яго Белай Сарокі, стаўшы яе слугой. Таксама ён не ўзбагаціўся, а зрабіўся вартаўніком яе незлічоных скарбаў. Па-другое, ён перамясціўся на поўнач, у палац Белай Сарокі, у творы – аналаг іншасвету (у казках і міфах функцыя птушкі – перанесці героя ў іншае царства). Да таго ж Скамароха зазнаў трансфігурацыю, змяніў чалавечае аблічча на мядзведжае. Мяркуем, так у сімвалічнай форме паказана духоўная смерць тых, хто стаў на бок чужынцаў, зрабіўшыся здраднікам, прывёўшы зло і пагібель у сваю краіну. Гаспадар перамясціўся на месца жывёлы, а значыць, дэградаваў, страціўшы свабоду (згадаем прозвішча героя: вядома, што скамарохі часта вадзілі мядзведзяў).

Другі ход з функцыйнай парай “барацьба – перамога” ўтрымлівае наступную паслядоўнасць падзей. Белая Сарока ўводзіцца як тыповы антаганіст: з’яўляецца раптоўна, спускаецца з неба (спачатку так уводзіцца яе пасланец). Першапачатковая мэта Сарокі – атрымаць звесткі пра людзей Беларусі і знайсці тут сабе адданых служкаў. Яна выконвае тыповую для антаганіста функцыю выведвання з мэтаю дазнацца пра прыроду і побыт мясцовых людзей, падрыхтавацца да распаўсюджання свайго ўплыву. Звесткі пра патэнцыйную ахвяру яна атрымлівае праз пана Скамароху (функцыя выдачы), які паддаецца на зманлівыя ўгаворы, абяцанні багацця і нечалавечых здольнасцяў (функцыя падману). Скамароха дапамагае ворагу (функцыя пасобніцтва). Потым антаганіст

выконвае шкодніцтва: забірае малако ў кароў, робіць заломы ў жыце, насылае зграі ваўкалакаў.

У кнізе *Шляхціц Завальня* вобраз сарокі сустракаецца і ў эпізодзе пра Арыну-сароку з апавядання *Зухаватыя ўчынкі*, дзе яна таксама выступае як антаганіст і робіць падобную шкоду. Але там перамога даецца проста: пры дапамозе свянцоных зёлак, васковай свечкі і стрэлу. Праўда, сарока была звычайная, мясцовая, таму сродкі барацьбы з ёй былі вядомыя. А Белая Сарока – чужаніца, ды яшчэ і надзвычай магутная. Героем – пераможцам антаганіста выступае беларускі народ, хоць перамога і не безумоўная: зло распаўзаецца па наваколлі.

У апавяданні *Дзіўны кій*, апошнім у кнізе, таксама вылучаюцца абедзве функцыйныя пары, якія дапаўняюць адна другую, у выніку чаго сюжэтны баланс урэшце дасягаецца. Марфалагічная будова гэтага апавядання, самага дынамічнага і феерычнага і ў кнізе, нагадвае чарадзейную казку, якая развіваецца ад нястачы – жадання героя-пратаганіста парабка Алешкі дапамагчы ўсім бедным людзям, праз атрыманне чароўнага прадмета – дзіўнага кія – да канчатковай перамогі над Вялікім Чарнакніжнікам. Разам з тым выконваюцца і задачы Плачкі: скамянелыя людзі вяртаюцца да жыцця і ўздымаюць рукі і вочы да неба, славячы Божую сілу і спадзеючыся на яе, прырода абуджаецца, і ўвесь край пачынае квітнець шчасцем і дастаткам. Сам жа Алешка ажаніўся з прыгожай і багатай князёўнай. Мяркуем, што тут адначасова магчымыя дзве інтэрпрэтацыі вобраза: у яе трансфармуецца сама Плачка-Беларусь, а шлюб сімвалізуе дасягненне шчасця і дабрабыту ў краіне; шлюб успрымаецца таксама як узвышэнне да веры і любові, як вяртанне хрысціянскіх каштоўнасцяў. Асабістае шчасце героя-пратаганіста выступае часткай і сімвалам сусветнай гармоніі.

Такім чынам, аналіз марфалагічнай структуры апавяданняў з кнігі Я. Баршчэўскага *Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях* паказаў, што ў творы паслядоўна вылучаюцца функцыйныя пары “барацьба – перамога” і “задача – рашэнне”, але раўнавага паміж элементамі гэтых параў пастаянна парушаецца ў межах асобных апавяданняў. На ўзроўні ж усяго твора ў цэлым дасягаецца баланс: задачы царэўны-Плачкі выконваюцца, а ў заключным апавяданні кнігі *Дзіўны кій* узнаўляецца паслядоўнасць казкавых элементаў, з новым, метафарычным значэннем, і выбудоўваецца ўжо не казка, а рамантычны міф.

## Спіс літаратуры

Barščèŭskì Ân. 2014. *Šlâhcìc Zaval'nâ, abo Belarus' u fantastyčnyh apavâdannâh*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura [Баршчэўскі Ян. 2014. *Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях*. Мінск: Мастацкая літаратура.].

Čukìčova Nadzeâ. 2017. *Kazkavasc' bez kazkì ŭ* Šlâhcìcy Zaval'nì *Âna Barščèŭskaga.* “Acta Albaruthenica” t. 17: 39–50 [Чукічова Надзея. 2017. *Казкавасць без казкі ў* Шляхціцы Завальні *Яна Баршчэўскага.* “Acta Albaruthenica” т. 17: 39–50].

Haŭstovìč Mìkola. 2003. *Mastackì metad Âna Barščèŭskaga.* Mìnsk: BDU [Хаўстовіч Мікола. 2003. *Мастацкі метад Яна Баршчэўскага.* Мінск: БДУ].

Propp Vladimir. 1969. *Morfologiâ skazki.* Moskva: Glavnaâ redakciâ vostočnoj literatury izdatel'stva «Nauka» [Пропп Владимир. 1969. *Морфология сказки.* Москва: Главная редакция восточной литературы издательства «Наука»].

*Struktura volšebnoj skazki.* 2001. Red. S.Û. Neklûdov. Moskva: RGGU [*Структура волшебной сказки.* 2001. Ред. С.Ю. Неклюдов. Москва: РГГУ].

**STRESZCZENIE**: Artykuł poświęcony jest badaniu roli par funkcjonalnych “walka – zwycięstwo” i “zadanie – decyzja” w strukturze 14 opowiadań Jana Barszczewskiego z książki *Szlachcic Zawalnia, czyli Białoruś w fantastycznych opowiadaniach*. Stwierdza się, że w pracy autora struktura kanoniczna baśni magicznej, w której obecność jednej z tych par jest obowiązkowa, ulega znacznej modyfikacji. Korelacja funkcjonalna zostaje zerwana na poziomie poszczególnych opowiadań, zdarzają się przypadki podwójnego znaczenia funkcji. Autor stosuje Łotmanowską technikę *minus-chwytu*, w której funkcje nie są realizowane, ale wskazane jest ich prawdopodobieństwo. Na poziomie całego dzieła równowaga fabuły została osiągnięta, a w ostatnim opowiadaniu *Dziwny kij* budowany jest romantyczny mit, w którym elementy baśniowe są sukcesywnie reprodukowane, nasycone nowym, metaforycznym znaczeniem.

**SŁOWA KLUCZOWE**: literatura białoruska XIX wieku, romantyzm, fabuła, morfologia baśni magicznej, funkcje heroiczne.

**АНАТАЦЫЯ**: Артыкул прысвечаны даследаванню ролі функцыйных пар “барацьба – перамога” і “задача – рашэнне” ў структуры 14 апавяданняў Яна Баршчэўскага з кнігі *Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях*. Робяцца высновы аб тым, што ў аўтарскім творы кананічная структура чарадзейнай казкі, у якой наяўнасць адной з гэтых пар з’яўляецца абавязковай, істотна мадыфікуецца. На ўзроўні асобных апавяданняў парушаецца функцыйная суадноснасць, назіраюцца выпадкі дваістага марфалагічнага значэння функцый. Аўтар выкарыстоўвае Лотманаўскую тэхніку мінус-прыём, пры якім функцыі не рэалізуюцца, але абазначаецца іх верагоднасць. На ўзроўні ж усяго твора ў цэлым сюжэтны баланс дасягаецца, і ў апошнім апавяданні *Дзіўны кій* выбудоўваецца рамантычны міф, у якім узнаўляецца паслядоўнасць казкавых элементаў з новым, метафарычным значэннем.

**КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ**: беларуская літаратура XIX стагоддзя, рамантызм, сюжэт, марфалогія чарадзейнай казкі, геройныя функцыі.

*Data przesłania artykułu: 01.10.2022*
*Data akceptacji artykułu: 20.10.2022*

## ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

**Hanna Krofta / Ганна Крофта** – Białoruś, Grodzieński Uniwersytet Państwowy im. Janki Kupały, Katedra Nauk Przyrodniczych i Dyscyplin Językowych oraz Metod Dydaktycznych; dr; specjalność naukowa: filologia białoruska; zainteresowania naukowe: literatura białoruska, językoznawstwo porównawcze.

**Adres**: Кафедра прыродазнаўчых і лінгвістычных дысцыплін і методык іх выкладання, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, вул. Захарава 32, 230023 Гродна, Białoruś.

**Wybrane publikacje (2021–2022):**

1. Крофта Ганна. 2021. *Мадыфікацыя структуры чарадзейнай казкі ў апавяданні* Белая Сарока *Яна Баршчэўскага*. "Роднае слова" № 12: 38–40.
2. Крофта Ганна. 2021. *Структурныя элементы чарадзейнай казкі ў апавяданні Я. Баршчэўскага* Валасы, якія крычаць на галаве (250–252). У: *Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: матэрыялы XIII Міжнар. навук. канф., прысвеч. 100-годдзю БДУ і 90-годдзю з дня нараджэння члена-карэспанд. НАН Беларусі, праф. А.А. Лойкі, Мінск, 28–29 кастр. 2021 г.* Мінск: БДУ.
3. Крофта Ганна. 2022. *Палёт паміж традыцыяй і будучыняй: ідэйна-эстэтычныя адметнасці кнігі* Крылы *Анатоля Брусевіча*. "Роднае слова" № 3: 38–42.